УДК 94(474/476)ВКЛ

# ПАВІННАСЦІ СЯЛЯН І МЯШЧАН ЛЯХАВІЦКАГА ГРАФСТВА НА КАРЫСЦЬ КАТАЛІЦКАЙ ПАРАФІІ Ў XVII–XVIII стст.

***П. Ю. Булаты***
аспірант
Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы

*Артыкул прысвечаны вывучэнню павіннасцей і падаткаў, якія выконваліся на карысць каталіцкай парафіі Святога Крыжа ў г. Ляхавічы ў перыяд XVII–XVIII стст. На падставе архіўных матэрыялаў (фундушовага запісу, актаў інспекцыі) аналізуецца ўзровень і дынаміка падаткаў і павіннасцей, якія датычыліся розных груп насельніцтва Ляхавіцкага графства.*

**Ключавыя словы:** Ляхавічы, каталіцкі касцёл, падаткі, павіннасці.

## Уводзіны

У сістэме зямельнага ўладання Вялікага Княства Літоўскага вылучаўся такі тып уладанняў, як царкоўныя. Значныя зямельныя абшары, фальваркі, вёскі, мястэчкі і гарады належалі каталіцкаму касцёлу: непасрэдна Віленскаму біскупству, манаскім ордэнам, парафіям. Адпаведна, на карысць духоўных устаноў вызначаліся плацяжы, маёмасныя і асабістыя абавязкі насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага. Падаткі і павіннасці былі рознага кшталту і датычыліся розных колаў і супольнасцей грамадства. Іх узровень, як правіла, залежаў ад эканамічных магчымасцей і рэсурсаў пэўнай мясцовасці. У айчыннай гістарыяграфіі склалася традыцыя даследавання тэмы павіннасцей і падаткаў такім чынам, што іх разгляд ажыццяўляецца ў залежнасці ад пэўных класаў. Мэта нашай працы – прааналізаваць і прасачыць дынаміку павіннасцей, якія датычыліся розных грамадскіх супольнасцей, аднак скіраваны былі на карысць аднаго ўладальніка – каталіцкай парафіі святога Крыжа, якая ахоплівала землі Ляхавіцкага графства. Крыніцамі, дзе акрэсліваюцца павіннасці на карысць Ляхавіцкага касцёла, з'яўляюцца: фундушовы запіс і акты касцельных візітацый розных гадоў. Дадзены корпус крыніц яскрава адлюстроўвае ўзровень, змест, дынаміку падаткаў і павіннасцей.

## Асноўная частка

Першы каталіцкі касцёл з тытулам Святога Войцеха ў Ляхавічах з'яўляецца яшчэ ў 1535 г. па фундацыі ўладара Ляхавіцкага маёнтка Альбрэхта Гаштольда [1]. З 1572 г. маёнтак належыць роду Хадкевічаў. Неўзабаве 12 траўня 1602 г. вялікі гетман Літоўскі Ян Караль Хадкевіч і яго жонка Соф'я Мілецкая далі фундушовы запіс на ўзвядзенне новага парафіяльнага касцёла ў Ляхавічах [2]. Поўны тытул новай святыні пазначаўся так: Exaltacionis Crucis Salutiferae, Assumptionis Beatissimae Virginis Mariae, Sancti Joannis Baptistae et Sanctae Zophiae – Узвіжання Крыжа Гасподняга, Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Мары, Святога Яна Хрысціцеля і Святой Сафіі. З таго часу парафія ў Ляхавічах мела тытул святога Крыжа. Род Хадкевічаў належаў да тытулаванай магнатэрыі Вялікага Княства Літоўскага, якой было ўласціва рабіць шчырыя ахвяраванні на карысць Касцёла. Асабліва можна адзначыць падтрымку парафій, якія знаходзіліся на землях рэзідэнцый роду. Ад сям'і Хадкевічаў Ляхавіцкі касцёл атрымаў шчырае матэрыяльнае забеспячэнне. Ва ўладанне ляхавіцкаму плябану з Ляхавіцкага графства перадаваліся: вёска Патапавічы з фальваркам, да якіх належала 16 і 4 валокі (1 валока = 21,36 га) зямлі адпаведна; фальварак Крэчатава (Krzeczetowo) з 8 валокамі, вёска Канюхі (Koniuszki) з 22 валокамі зямлі і фальваркам, да якога адносіўся млын на рацэ Трасцянка (Troscianka). Вёскі перадаваліся разам з сялянамі [2]. Апроч сялян, для касцёла ў саміх Ляхавічах стваралася юрыдыка – частка горада, якая падпарадкоўвалася царкве і на жыхароў якой не пашыралася гарадская судовая і адміністрацыйная ўлада. Апроч таго, фундушовым запісам вызначаліся падаткі, якія мусілі паступаць на карысць парафіі з Ляхавічаў і Ляхавіцкага графства.

Можна вылучыць наступныя віды падаткаў і павіннасцей, якія ўсталяваліся ў 1602 г і прасочваюцца да канца XVIII ст.: *паншчына* – праца сялян з

© Булаты П. Ю., 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

уласным інвентаром на касцельнай гаспадарцы; *чынш* – грашовы падатак; *дзякла* – натуральная даніна, якая складалася з прадуктаў сельскай гаспадаркі і прыродных дароў. Акрамя штотыднёвай паншчыны, вызначаліся сезонныя *адработачныя павіннасці* (гвалты, талокі), звязаныя са жнівом, сенакосам. Вылучым сацыяльныя групы, якіх датычыліся павіннасці і падаткі на карысць касцёла: мяшчане Ляхавічаў, жыхары юрыдыкі, Ляхавіцкі кагал, сяляне Ляхавіцкага графства, сяляне падуладных касцельных вёсак.

**Ляхавіцкія мяшчане**. Згодна з фундушам ад 1602 г. на жыхароў Ляхавічаў на карысць парафіі накладаўся "на вечныя часы" падатак двух відаў: чынш і дзякла. Так, агульная сума грашовых выплат з Ляхавічаў складала 20 коп грошай літоўскіх (1 капа = 60 грошам) у год; вызначалася, што з кожнага двара мусіць брацца ўнёсак памерам 6 грошай (можна меркаваць, што агульная колькасць двароў у Ляхавічах на той час раўнялася 200). Таксама з усіх двароў уздымалася 41 капа жыта [2].

Наступныя звесткі, што датычацца выплат парафіі ад мяшчан, адносяцца да 1745 г. і змяшчаюцца ў акце касцельнай інспекцыі. Агульныя сумы чыншу і дзякла засталіся нязменнымі: 20 коп грошай і 40 карцоў жыта. Толькі размеркаванне па дварах скарацілася: ½ ад 8 грошай з падворка, што тлумачыцца ростам іх колькасці (вынікае, што ў 1745 г. у Ляхавічах было 300 двароў) [3].

Змены ў абкладанні падаткам мяшчан адбыліся ў канцы XVIII ст. Так, згодна з актам касцельнай візітацыі 1782 г. дзякла жытам замянялася грашовымі выплатамі. Агульная сума, якую павінны былі выдатковаць жыхары Ляхавічаў, складала 640 злотых [4].

**Юрыдыка**. Паводле фундуша 1602 г за Ляхавіцкім касцёлам замацоўвалася юрыдыка. Змяшчалася яна на вуліцы Клецкай і ў яе склад уваходзілі пляцы мяшчан Кірыловічаў (Kyralowycz) і Крывапустаў (Krziwopusty). Першапачаткова за ляхавіцкімі юрыдычанамі замацоўвалася толькі павіннасць выконваць пэўныя працы на патрэбу парафіі, самі віды прац не акрэсліваліся. Няма звестак і адносна грашовых выплат [2].

У 1745 г., згодна з актам касцельнай візітацыі, у склад царкоўнай юрыдыкі ўваходзіла 16 падворкаў, жыхары якіх займаліся агародніцтвам. На падуладнай касцёлу вуліцы знаходзіліся хаты не толькі хрысціян (каталікі альбо ўніяты), але і прадстаўнікоў іншых рэлігій: у вопісе жыхароў юрыдыкі згадваюцца 4 хаты, дзе жылі татары, а таксама дзве хаты яўрэяў. Усе юрыдычане выконвалі аднолькавыя павіннасці. У параўнанні з мінулымі звесткамі працоўныя павіннасці жыхароў юрыдыкі дакладна акрэсліваліся; ўводзіліся грашовыя выплаты. Так, жыхары юрыдыкі мусілі выплачваць чынш са сваіх агародаў: з кароткіх 2 злотых, з доўгіх – 4 злотыя. Адзначаюцца наступныя працы: талака падчас жніва (5 талок, па адным чалавеку з кожнага дому); варта касцёла (удвух па чарзе); павіннасць дастаўляць лісты (па чарзе далей за 5 міль літоўскіх (адпавядала 7,7985 км)) [3].

Па стане на 1782 г. касцельная юрыдыка складалася з 18 пляцаў, дзе жылі хрысціяне і татары. Аднак да гэтага часу адбыліся пэўныя перамены ў сацыяльным статусе падданых-юрыдычан. Як адзначаецца ў візіце, імёны, прозвішчы, сем'і падданых у дакумент не ўносяцца з той прычыны, што яны з'яўляюцца вольнымі людзьмі і ў любы час свабодна могуць прадаць свае пабудовы. Аднак пакуль жывуць на падуладных касцёлу пляцах, мусяць выплачваць наступныя падаткі: штогадовая выплата падымнага падатку памерам 120 злотых і чыншу на свята святога Марціна (11 лістапада) 100 злотых. З адработачных павіннасцей адзначаюцца: праца на жніве (5 дзён адпрацоўкі з кожнага пляцу), начная варта каля касцёла па двое па чарзе [4].

**Кагал.** Абавязак выплачваць грашовую суму на карысць каталіцкай парафіі мела і ляхавіцкая яўрэйская супольнасць. Інфармацыя аб усталяванні выплаты ў фундушовым запісе 1602 г. не пазначаецца. Не выяўлена звестак аб гэтым і ў іншых дакументах. Аднак у акце візітацыі 1745 г. у пераліку даходаў касцёла адзначаецца, што Ляхавіцкі кагал выплачваў парафіі 300 злотых [3]. У 1782 г. сума выплаты кагалам складала ўжо 400 злотых [4]. Але выплаты ад кагалу паступалі не заўжды і касцёлу даводзілася спаганяць гро-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шы праз суд. Так, сярод актаў Духоўнага Трыбуналу Вялікага Княства Літоўскага за 1786 г згадваецца справа паміж пробашчам ляхавіцкага касцёла і ляхавіцкім кагалам [5]. Справа, звязаная з нявыплатай яўрэйскай супольнасцю належнай касцёлу сумы, была вырашана на карысць парафіі.

**Сяляне Ляхавіцкага графства.** Згодна з фундушовым запісам 1602 г., з вёсак, фальваркаў і грунтаў Ляхавіцкага графства вызначалася касцёлу дзесяціна. Пад дзесяцінай разумеецца прынашэнне царкве дзясятай часткі даходаў, якая прызначалася на ўтрыманне парафіі і пробашча. Дзесяціна была снопавая (сяляне адкладвалі кожны 10-ы сноп) і агульная (1/10 частка збожжа, мёду і інш.). Фундуш вызначаў дзесяціну памерам у 50 коп жыта. У выпадку адсутнасці жыта прадугледжвалася грашовая альтэрнатыва – 50 злотых [2].

Падрабязны расклад дзесяціны для Ляхавіцкага графства прадстаўлены ў табліцы 1, датуецца 1721 г. вызначана яна ўраднікамі на кадэнцы да Графства Ляхавіцкага дэкрэтам Галоўнага Трыбуналу ВКЛ у 1720 г. [6].

*Табліца 1* – Расклад дзесяціны жытам ад 27 студзеня 1721 г. да Ляхавіцкага графства касцёлу Ляхавіцкаму

| Вёска | Копы жыта | Снопы жыта | Грошы (копы) |
|---|---|---|---|
| Вялікая Лотва | 10 | - | 50 |
| Малая Лотва | 3 | - | 20 |
| Мыслабаж | 1 | 40 | 10 |
| Голдавічы | 3 | - | 15 |
| Ганцэвічы | - | 20 | 6 |
| Вадзяцін | - | 15 | 3 |
| Літва | | 30 | 8 |
| Старыя Ляхавічы і Падлессе | 10 | 40 | 55 |
| Шавялі | 5 | 20 | 20 |
| Зарытава і Жарабковічы | 10 | - | 55 |
| Зубялевічы з зямянамі | 4 | - | 23 |
| Гулічы | 1 | - | 3 |
| Skure | - | 15 | 2 |
| **Агулам** | **50** | **-** | **270** |

Усталяваныя лічбы выплат – 50 коп жыта (альтэрнатыва – 50 злотых) і 270 коп грошай – стабільна паступалі парафіі з Ляхавіцкага графства ў 1745 г. [3] і 1782 г [4]. Паўторнае зацвярджэнне дзесяціны адбылося ў 1793 г., і расклад сум застаўся нязменным [1].

**Сяляне падуладных касцёлу вёсак**. Да дадзенай групы насельніцтва адносілася найбольшая колькасць павіннасцей і падаткаў рознага кшталту. Як адзначалася вышэй, за Ляхавіцкім касцёлам, згодна з фундушам, замацоўваліся дзве вёскі з сялянамі: Патапавічы і Канюхі [2]. Аднак у дакуменце не пазначаюцца звесткі адносна павіннасцей сялян. Сустракаюцца яны ў акце візітацыі 1668 г. Адзначалася, што сяляне павінны выходзіць на паншчыну 5 дзён з дыму. Дадатковыя адпрацоўкі ўяўлялі сабою 4 талакі, варту па чарзе на плябаніі і ў фальварку. Чыншу вызначалася ў год з адной валокі 5 злотых. Дзякла з адной валокі ўздымалася: бочка жыта (віленскай меры) і аўса, 20 яек, воз сена, мёд (хто трымаў пасеку) [7].

У 1745 г. сялянам, якія жылі ў касцельных вёсках, выстаўляліся наступныя павіннасці. Кожны тыдзень зімой і летам з інвентаром сяляне павінны былі выходзіць на працы, а норма вызначалася наступная: з паўвалокі 3 дні. Усталёўвалася адпрацоўка 4 талок улетку (час жніва). На працу сяляне мусілі заўжды выходзіць з узыходам сонца і працаваць да заходу. Захоўвалася павіннасць несці варту: па чарзе да плябаніі і фальварка. На начную варту трэба было выходзіць удвух. Па чарзе сяляне выстаўлялі падводу: на-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

далей за 30 міль з аднае валокі. Чынш складаў 15 грошай наяўнымі з кожнай паўвалокі. Апроч таго з кожнай паўвалокі сяляне мусілі даваць: палову бочкі аўса меры віленскай; два каплуны альбо адну гусь, дзясятак яек, чатыры курыцы; пры наяўнасці пасекі – палову мёду, воз сена [3].

У 1782 г. сяляне з Патапавічаў і Канюхоў мусілі адпрацаваць з кожнай паўвалокі тры дні на тыдзень на патрэбу двара. Падчас жніва адпрацоўка складала шэсць дзён. Вызначалася тыднёвая варта па трох улетку і ўзімку. Чыншавая сума складала 3 злотыя з паўвалокі. Прадуктамі выдавалі: ляхавіцкі карэц жыта, карэц аўса, аднаго каплуна і 10 яек. Звернем увагу на тое, што ў дакуменце за 1782 г., дзе акрэсліваецца дзякла, побач з пералікам колькасці прадуктаў прыводзіцца яе альтэрнатыва ў грашовым эквіваленце. Так, агульнае паступленне жыта вартае 864 злотыя, аўса – 432 злотыя, каплуны ацэньваюцца ў 72 злотыя, яйкі – у 9 злотых [4].

Для больш нагляднага адлюстравання дынамікі ў павіннасцях і падатках для розных сацыяльных груп Ляхавіцкага графства, абагульнім прыведзеныя вышэй дадзеныя ў табліцы 2.

*Табліца 2* – Павіннасці і падаткі на карысць Ляхавіцкага касцёла

<table>
<tr><th colspan="8">ЛЯХАВІЦКІЯ МЯШЧАНЕ</th></tr>
<tr><th>ГОД</th><th>ПАНШЧЫНА</th><th colspan="3">АДПРАЦОЎКА</th><th colspan="2">ЧЫНШ</th><th>ДЗЯКЛА</th></tr>
<tr><td>1602</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">20 коп гр.<br>6 гр./двор</td><td>41 капа жыта</td></tr>
<tr><td>1745</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">20 коп гр.<br>½ 8 гр./двор</td><td>40 карцоў жыта</td></tr>
<tr><td>1782</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="3">640 зл.</td></tr>
<tr><th colspan="8">ЮРЫДЫКА</th></tr>
<tr><th>ГОД</th><th>ПАНШЧЫНА</th><th colspan="3">АДПРАЦОЎКА</th><th colspan="2">ЧЫНШ</th><th>ДЗЯКЛА</th></tr>
<tr><td>1602</td><td>—</td><td colspan="3">акрэслена наяўнасць</td><td colspan="2">—</td><td>—</td></tr>
<tr><td rowspan="2">1745</td><td rowspan="2">—</td><td>Талокі на жніве</td><td>Варта</td><td>Дастаўка лістоў</td><td>Кароткі агарод</td><td>Доўгі агарод</td><td rowspan="2">—</td></tr>
<tr><td>5</td><td>Удвух па чарзе</td><td>Па чарзе на 5 міль</td><td>2 зл.</td><td>4 зл.</td></tr>
<tr><td rowspan="2">1782</td><td rowspan="2">—</td><td rowspan="2">5</td><td rowspan="2">Удвух па чарзе</td><td rowspan="2">—</td><td>Падатак (зл.)</td><td>Чынш (зл.)</td><td rowspan="2">—</td></tr>
<tr><td>120</td><td>100</td></tr>
<tr><th colspan="8">КАГАЛ</th></tr>
<tr><th>ГОД</th><th>ПАНШЧЫНА</th><th colspan="3">АДПРАЦОЎКА</th><th colspan="2">ЧЫНШ</th><th>ДЗЯКЛА</th></tr>
<tr><td>1745</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">300 зл.</td><td>—</td></tr>
<tr><td>1785</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">400 зл.</td><td>—</td></tr>
<tr><th colspan="8">ЛЯХАВІЦКАЕ ГРАФСТВА</th></tr>
<tr><th>ГОД</th><th>ПАНШЧЫНА</th><th colspan="3">АДПРАЦОЎКА</th><th colspan="2">ЧЫНШ</th><th>ДЗЯКЛА</th></tr>
<tr><td>1602</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">—</td><td>50 коп жыта / 50 зл.</td></tr>
<tr><td>1721</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">270 коп гр.</td><td>50 коп жыта / 50 зл.</td></tr>
<tr><td>1782</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">270 коп гр.</td><td>50 коп жыта / 50 зл.</td></tr>
<tr><td>1793</td><td>—</td><td colspan="3">—</td><td colspan="2">270 коп гр.</td><td>50 коп жыта / 50 зл.</td></tr>
</table>

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Канчатак табліцы 2*

| СЯЛЯНЕ КАСЦЕЛЬНЫХ ВЁСАК | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **ГОД** | **ПАНШЧЫНА** | **АДПРАЦОЎКА** | | | **ЧЫНШ** | **ДЗЯКЛА** | | | | | | |
| **1602** | *акрэслена наяўнасць* | | | | | | | | | | | |
| | — | Талокі на жніве | Варта | Падвода | | Жыта | Авёс | Сена | Каплун/ гусь | Куры | Яйкі | Мёд |
| **1668** | 5 дзён з дыму/ 1 валоку | 4 | Удвух па чарзе | — | 75 гр./ ½ валокі | ½ бочкі | ½ бочкі | 1 воз | — | — | — | + |
| **1745** | 3 дні / ½ валокі | 4 | Удвух па чарзе | + | 15 гр. / ½ валокі | ½ бочкі | ½ бочкі | 1 воз | 2 альбо 1 | 4 | 10 | 1/2 |
| **1782** | 3 дні / ½ валокі | 6 дзён | Утрох па чарзе | — | 90 гр. / ½ валокі | 1 карэц | 1 карэц | — | 1 | — | 10 | — |

Так, можна акрэсліць наступную дынаміку павіннасцей і падаткаў для розных сацыяльных груп Ляхавіцкага графства цягам амаль двух стагоддзяў.

Для *ляхавіцкіх мяшчан*, якіх датычыцца толькі чынш і дзякла, сумы, усталяваныя фундошовым запісам, застаюцца амаль нязменнымі: змяняецца мера вымярэння жыта, у сувязі з ростам колькасці двароў змяншаецца сума выплаты з аднаго падворка. Таксама назіраецца пераход ад дзякла да грашовага чыншу.

*Юрыдычан* датычыцца адпрацоўка і чынш. Цягам XVIII ст. адбываюцца істотныя змены для дадзенай катэгорыі насельніцтва. Істотна змяняецца сістэма выплаты чыншу: фіксаваны падатак на ўтрыманне агароду замяняецца агульным падымным падаткам, уводзіцца дадатковы збор чыншу. Змяняюцца і адпрацоўкі: скасоўваецца павіннасць дастаўляць лісты. Самыя галоўныя змены, якія адбыліся для юрыдыкі, – змена сацыяльнага статусу і атрыманне магчымасці юрыдычанам свабодна прадаваць свае будоўлі.

Ляхавіцкі *кагал* выплачваў парафіі чынш, сума якога з 1745 па 1782 г. павялічылася на 100 злотых.

Для *сялян Ляхавіцкага графства*, адносна якіх усталёўвалася дзесяціна – грашовая і натуральная, сума падатку не змянялася цягам усяго акрэсленага перыяду.

Найбольшая колькасць разнастайных павіннасцей і падаткаў датычылася *сялян падуладных парафіі вёсак.* За акрэслены перыяд змяніўся разлік адпрацоўкі паншчыны. Калі ў 1668 г. колькасць дзён вызначалася на 1 валоку, то ў XVIII ст. разлічвалася на ½ валокі. Звязана гэта з тым, што за пераважнаю большасцю сялян, згодна з інвентарамі, было замацавана менавіта ½ валокі зямлі (адзначаецца і па ¼ валокі на двор) [4]. Для сялян павялічылася колькасць дзён адпрацоўкі на талацэ. Назіраецца змяненне відаў адпрацоўкі. Грашовы чынш досыць не раўнамерны. Калі ў 1668 г. ён складае 75 гр., то ў 1745 г – 15 гр., але ў 1782 г узрастае да 90 гр. Зазначым, што ў год нізкага чыншу назіраецца шырокі спектр прадуктаў, якія пастаўляліся па дзяклу, нормы якога заставаліся амаль нязменнымі. Наогул жа, назіраецца тэндэнцыя да павышэння сумы грашовых выплат і перавод дзякла ў чынш.

Грашовы чынш ад розных груп насельніцтва з'яўляўся істотнай крыніцай даходу парафіі. Так, агульная сума даходаў Ляхавіцкага касцёла ў 1782 г. састаўляла 15668 зл., з якіх 12000 зл. – алтарныя ахвяраванні, а 3036 зл. – паступленні ад выплат павіннасцей. Доля ад гэтых вы-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

плат складае 20% усёй сумы даходаў парафіі [4].

### Заключэнне

Такім чынам, прааналізаваўшы і прасачыўшы дынаміку павіннасцей, якія датычыліся розных грамадскіх супольнасцей, што былі скіраваны на карысць аднаго ўладальніка – каталіцкай парафіі Святога Крыжа, якая ахоплівала землі Ляхавіцкага графства, адзначым наступнае:

1. Павіннасці і падаткі, якія былі ўсталяваныя на карысць парафіі, датычыліся разнастайных груп насельніцтва маёнтка. Найбольшая колькасць відаў павіннасцей датычылася сялян падуладных Касцёлу вёсак, найменшая – кагалу. Самай распаўсюджанай павіннасцю, якая датычылася ўсіх груп насельніцтва, з'яўляўся грашовы чынш.

2. Дынаміка павіннасцей у перыяд XVII–XVIII ст. досыць неаднародная. Некаторыя павіннасці заставаліся нязменнымі з часоў іх усталявання ў фундошовым запісе, аднак большасць з іх мелі тэндэнцыю на павышэнне. Аднак некаторыя з іх, якія датычыліся адпрацоўкі і дзякла, скасоўваліся наогул.

3. Назіраецца тэндэнцыя замены дзякла на грашовы чынш, што датычылася розных груп насельніцтва.

4. Для Ляхавіцкай парафіі грашовыя паступленні з'яўляліся значнай часткаю даходаў+.

### *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1738. Воп. 1. Спр. 1. Л. 195 – 200.
2. Vilniaus universiteto biblioteka. – F. 57. Воп. Б53. Спр. 1338. Л. 3–5.
3. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 213. С. 8 – 21.
4. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 223.
5. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 9. Воп. 1. Спр. 2401.
6. Vilniaus universiteto biblioteka. – F. 5. Воп. F123 Спр. 31380/1.
7. Vilniaus universiteto biblioteka. – F. 57. Воп. Б53. Спр. 41. Л. 105–111.


Паступіў у рэдакцыю 12.01.2018 г.
Кантакты: pawelbulaty@gmail.com
(Булаты Павел Юр'евіч)

**Bulaty P. DUTIES OF PEASANTS AND PETTY BOURGEOIS OF LYAKHOVICHI COUNTY IN FAVOUR OF CATHOLIC PARISH IN THE XVII–XVIII CENTURIES.**

*The research focuses on the duties and taxes of the Holy Cross parish in Lyakhovichi (Brest region, Belarus) in the XVII–XVIII centuries. The level and dynamics of taxes for different social groups are analyzed according to the archival data.*

**Keywords:** Lyakhovichi, Catholic Church, taxes, duties.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова